УДК 947.6 «1917»

І. М. Рыжанкоў, дацэнт, канд. гіст. навук (БДТУ, г. Мінск)

# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ НА ЭТАПЕ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЗЕМСКІХ ВЫБАРАЎ: ПА МАТЭРЫЯЛАХ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ (ВЯСНА-ЛЕТА 1917 Г.)

З атрыманнем усімі грамадзянамі Расійскай імперыі права на фарміраванне ўладных структур і ўдзел у іх дзейнасці ў розных частках краіны, з улікам мясцовых асаблівасцей, узніклі самыя шматлікія і сацыяльна аднародныя органы ўлады – валасныя камітэты. На Беларусі, як і паўсюдна па краіне, іх утварэнне адбывалася з выгляду дэмакратычнымі метадамі, але па напрамках дзейнасці яны не адпавядалі патрэбам дзяржавы і астатняга грамадства. У сакавіку ў мэтах умацавання даверу да новай улады і яе дзей-снага функцыянавання, кола ўдзельнікаў «цэнзавых» земскіх сходаў істотна пашырылася за кошт асобных сацыяльных пластоў насельніцтва, раней пазбаўленых выбарчых правоў, з папаўненнем ліку гласных прадстаўнікамі Саветаў рабочых, салдацкіх, сялянскіх дэпутатаў працэс дэмакратызацыі земстваў завяршыўся. Але ў планах рэфармавання ўладных структур іх дэмакратызацыя з’яўлялася толькі першым яго этапам і мусіла саступіць месца выбарчаму прынцыпу. Неўзабаве новае выбарчае заканадаўства было распрацавана Асобай нарадай пад кіраўніцтвам таварыша міністра ўнутраных спраў С. М. Лявонцьева. Дэмакратычна абраным земствам як органам дзяржаўнага самакіравання надавалася прынцыпова важнае значэнне. Разам з гарадскімі думамі ім належала замяніць усе часовыя, надзвычайныя органы ўлады, створаныя ў ходзе Лютаўскай рэвалюцыі, адпаведна зрабіцца інструментам ажыццяўлення пастаноў маючага адбыцца Устаноўчага схода і ў далейшым – быць асновай рэальнага народаўладдзя.

Відавочна, што ўрадавыя сілы прыклалі ўсе намаганні, каб сялянства мела магчымасць дэмакратычным шляхам скарыстаць сваё права абіраць і быць абранымі ў органы самакіравання. У гэтым жа накірунку дзейнічалі шматлікія дзяржаўныя і грамадска-палітычныя арганізацыі, іх органы друку. У час перадвыбарчай кампаніі сялянства сустракалася з агітатарамі і мела магчымасць пазнаёміцца з партыйнымі праграмамі, што спрыяла яго далейшай палітычнай сацыялізацыі і ўцягненню ў вырашэнне дзяржаўных спраў, але выявілі нізкую выбарчую актыўнасць [1, арк. 194].

ЛІТАРАТУРА

1 Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Фонд 1778. Воп. 1. Спр. 302.